# Стварыць гісторыю бібліятэк

У Дзяржаўнай бібліятэцы імя У. І. Леніна адбылася нарада, у якой прынялі ўдзел работнікі масавых бібліятэк, загадчыкі бібліятэк аўтамабільнага і трактарнага заводаў, выкладчыкі бібліятэчнага факультэта педінстытута, навуковыя работнікі бібліятэк імя У. І. Леніна, імя Якуба Коласа, імя М. Горкага, ВНУ, ветэраны бібліятэчнай работы.

Адбылася цікавая творчая размова ў сувязі з артыкулам, апублікаваным у «Звяздзе», «Гісторыя бібліятэк рэспублікі».

Удзельнікі нарады адзначалі, што далёка не ўсе бібліятэкі займаюцца сваёй гісторыяй, не збіраюць і не абагульняюць матэрыялы па гісторыі бібліятэчнай справы ў раёнах, гарадах, абласцях. Між тым набыты ўжо цікавы вопыт і яго трэба пашыраць. Гродзенская абласная бібліятэка апублікавала артыкулы па сваёй гісторыі. Праведзена навукова-практычная канферэнцыя па гісторыі бібліятэк г. Мінска.

Настойліва выказвалася думка аб тым, што побач з выданнем гісторыі асобных бібліятэк трэба ўтварыць аўтарскі калектыў для напісання нарысаў па гісторыі бібліятэчнай справы ў рэспубліцы. Асноўнае ядро аўтарскага калектыву могуць скласці выкладчыкі бібліятэчнага факультэта Мінскага педінстытута імя М. Горкага, навуковыя работнікі бібліятэк імя У. І. Леніна, імя Якуба Коласа. Трэба, каб прадстаўнікі культмасавага аддзела Белсаўпрофа і аблсаўпрофа больш актыўна ўдзельнічалі ў дзейнасці камісіі па гісторыі бібліятэчнай справы.

С. АПАРЫН.